# ДЗЕНЬ ДОБРЫ НОВЫ НАВУЧАЛЬНЫ ГОД!


ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 22 (582) | Субота, 1 верасня 1984 года | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.


У гэтым годзе пастановай Вярхоўнага Савета СССР 1-е верасня аб'яўлена ўсенародным святам — Днём ведаў.

Па ўсёй нашай неабсяжнай краіне празвініць сёння школьны званок для маленькіх грамадзян, для тых, хто толькі пачынае свой шлях у Краіну ведаў, для' мільёнаў хлопчыкаў і дзяўчынак, якія будуць працягваць цікавае падарожжа ў свет нязведанага. Пакліча першы вераснёўскі дзень у вучэбныя аўдыторыі навучэнцаў тэхнікумаў, студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў.

## СЁННЯ— СВЯТА ВЕДАЎ

I як заўсёды, 1-га верасня гасцінна расчыняцца перад дапытлівай і няўрымслівай дзетварой дзверы новых светлых і прасторных школ. Атрымаюць у падарунак ад будаўнікоў новыя прыгожыя карпусы з пасучасному абсталяванымі для плённай вучобы аўдыторыямі і студэнты ВНУ. Камуністычная партыя і Савецкі ўрад робяць усё для таго, каб моладзі быў адкрыты шлях у навуку. Клопаты аб школе і народным настаўніку — важнейшая партыйная і дзяржаўная задача.

Сёлета 1-е верасня — пасабліваму знамянальны дзень. I не толькі таму, што афіцыйна пачаў лічыцца ўсенародным святам. З сённяшняга дня пачынаецца новы, якасна вышэйшы этап у развіцці савецкай школы. Ажыццяўленне на практыцы ўсенародна абмеркаваных і адобраных «Асноўных напрамкаў рэформы агульнаадукацыйнай і прафесіянальнай школы» забяспечыць глыбокае авалоданне вучнямі асновамі навук, будзе фарміраваць у іх працалюбства, трывалыя камуністычныя перакананні, маральную чысціню. Рэалізацыя рэформы дазволіць карэнным чынам палепшыць працоўнае выхаванне і прафесіянальную арыентацыю школьнікаў.

Школа — напярэдадні вялікіх перамен. Якія б яны ні былі, нязменным застаецца адно: цэнтральная фігура ў народнай адукацыі — настаўнік. Яму выхоўваць перакананых барацьбітоў за камунізм, патрыётаў і інтэрнацыяналістаў, прывіваць вучням высокія грамадзянскія ідэалы і маральныя якасці. Вялікі гонар і вялікая адказнасць — выхоўваць падрастаючае пакаленне. Гэта высакародная місія ўскладваецца і на выпускнікоў педагагічных спецыяльнасцей Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, якія прыступілі да працы на месцах свайго прызначэння. Ім — прымаць удзел у пераўтварэнні народнай адукацыі, а значыць, высока несці марку вядучай навучальнай установы Беларускага Палесся.

У моры кветак патануць сёння школы ў маленькіх вёсачках і вялікіх гарадах. Звініць званок і кліча ў новы паход за ведамі.

### ВІНШУЕМ!

Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат біялагічнага факультэта, кафедра заалогіі і аховы прыроды горача віншуюць асістэнта гэтай кафедры ВЕРАМЕЕВА Васіля Мікалаевіча з выпадку зацвярджэння яго ВАКам у вучонай ступені кандыдата біялагічных навук.

*Слова да першакурснікаў*

## ПАМНАЖАЙЦЕ ЛЕПШЫЯ ТРАДЫЦЫІ

Ва ўрачыстай абстаноўцы 700 юнакоў і дзяўчат уліваюцца ў студэнцкую сям'ю нашага універсітэта. Усе яны паспяхова вытрымалі конкурсныя экзамены, паказалі на іх грунтоўнае веданне школьнай праграмы і заваявалі права заняць месца ў вядучай вышэйшай навучальнай установе Беларускага Палесся. Імі сталі ўчарашнія школьнікі і звольненыя ў запас з радоў Савецкай Арміі воіны, слухачы падрыхтоўчага аддзялення і моладзь, якая прайшла ўжо пэўную працоўную загартоўку.

У нашым універсітэце стала добрай традыцыяй у першы дзень заняткаў праводзіць пасвячэнне першакурснікаў у студэнты. Для вас, дарагія таварышы, гэта ўрачыстасць будзе асабліва знамянальнай. Вы атрымаеце студэнцкія білеты ў Дзень ведаў — на свята, якое адзначаецца ў нашай краіне ўпершыню. Заўсёды памятайце аб гэтым і будзьце дастойнымі, тых вялікіх бацькоўскіх клопатаў, якія праяўляюць аб вашай прафесіянальнай падрыхтоўцы, камуністычным выхаванні родная партыя, Савецкі ўрад, Ленінскі камсамол.

Вельмі ганарова і разам з тым адказна стаць студэнтам вышэйшай навучальнай установы ў час паўсямеснай рэалізацыі пастановы ЦК КПСС аб рэформе агульнаадукацыйнай і прафесіянальнай школы. Нястомна авалодвайце ведамі, каб, стаўшы маладымі спецыялістамі, здолелі ўнесці ў гэтую важную агульнанародную справу свой дастойны ўклад.

Дарагія першакурснікі! Вы сталі студэнтамі ў перыяд, калі наша шматнацыянальная краіна, усе прагрэсіўнае чалавецтва рыхтуюцца да знамянальнай даты — 40-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Сваёй вучобай і ўсімі справамі будзьце вартымі памяці тых, хто ў жорсткіх баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў праявіў высокі патрыятычны абавязак, выключную мужнасць і гераізм, непахісную вернасць Радзіме, не пашкадаваў свайго жыцця для нашага шчаслівага сёння, мірнага неба, ажыццяўлення усіх самых запаветных мар.

Студэнцкія гады — не лёгкія. Яны патрабуюць максімальнай аддачы сіл і маладой энергіі, паўсядзённага працалюбства, творчай думкі. Адначасова гэта ў жыцці і самая памятная пара. Пастарайцеся, каб у будучым яна прыносіла вам толькі самыя добрыя ўспаміны.

У нашым універсітэце ёсць усе магчымасці для таго, каб стаць не толькі высокакваліфікаваным спецыялістам, але і праявіць, развіць свае здольнасці ў мастацкай самадзейнасці, спорце, літаратуры, іншых абласцях культурнага і фізічнага ўдасканальвання. Старайцеся выкарыстаць іх з усёй паўнатой.

Мы шчыра ўпэўнены у вас, нашы дарагія першакурснікі! Дык высока трымайце марку Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, старайцеся вучыцца і працаваць так, каб вамі ганарыліся выкладчыкі, бацькі, былыя школьныя настаўнікі, таварышы.

Шчаслівага шляху ў Краіну ведаў!

РЭКТАРАТ, ПАРТКОМ, КАМІТЭТ ЛКСМБ, ПРАФКОМ СТУДЭНТАЎ.

## АБ ПРАВЯДЗЕННІ АБЛАСНОГА АГЛЯДУ СТУДЭНЦКІХ АТРАДАЎ, ЯКІЯ ПРАЦУЮЦЬ НА УБОРЦЫ БУЛЬБЫ І АГАРОДНІНЫ У 1984 ГОДЗЕ

Прэзідыум савета абласнога аграпрамысловага аб'яднання, прэзідыум аблсаўпрофа і бюро абкома ЛКСМБ вырашылі ў верасні—кастрычніку 1984 года правесці абласны агляд студэнцкіх атрадаў, якія заняты на ўборцы бульбы і агародніны. Зацверджаны ўмовы агляду. Створаны аргкамітэт па яго правядзенню. Пераможцы абласнога агляду атрымаюць грашовыя прэміі.

Раённым аграпрамысловым аб'яднанням, райкомам, гаркомам камсамола, райкомам прафсаюза работнікаў сельскай гаспадаркі прапанавана правесці раённыя агляды студэнцкіх атрадаў, занятых на ўборцы бульбы і агародніны восенню гэтага года.

## УМОВЫ АБЛАСНОГА АГЛЯДУ СТУДЭНЦКІХ АТРАДАЎ НА УБОРЦЫ БУЛЬБЫ І АГАРОДНІНЫ ВОСЕННЮ 1984 ГОДА

У абласным аглядзе прымаюць удзел студэнцкія атрады, якія працуюць у калгасах і саўгасах вобласці на ўборцы бульбы і агародніны восенню 1984 года.

Галоўная мэта агляду забяспечыць актыўны ўдзел студэнцкіх атрадаў у выкананні задач, намечаных XXVI з'ездам КПСС, XXIX з'ездам КПБ, наступнымі Пленумамі ЦК КПСС па рэалізацыі Харчовай праграмы, а таксама ўзмацненне выхаваўчай і грамадска-палітычнай работы сярод студэнцкай і навучэнцкай моладзі, у калектывах калгасаў і саўгасаў.

Пераможцамі ў аглядзе будуць прызнаны студэнцкія атрады, якія дабіліся лепшых вынікаў:

— у росце прадукцыйнасці працы;

— у павышэнні ўнутрыатраднай дысцыпліны;

— у паляпшэнні якасці выконваемых работ;

— у выкананні норма-змен;

— у скарачэнні ўстаноўленых тэрмінаў уборкі ўраджаю;

— у арганізацыі грамадска-палітычнай і ідэйна-выхаваўчай работы ў месцах дыслакацыі.

Атрады, у якіх будуць мець месца факты траўматызму, парушэння правілаў тэхнікі бяспекі, унутрыатраднай дысцыпліны, невыканання норма-змен, у аглядзе не ўдзельнічаюць.

Раённыя, гарадскія камітэты камсамола разглядаюць вынікі работы атрадаў і пасля ўзгаднення з саветам раённага аграпрамысловага аб'яднання і райкомам прафсаюза да 10 кастрычніка 1984 года прадстаўляюць у абласны штаб студэнцкіх будаўнічых атрадаў АК ЛКСМБ матэрыялы па ўстаноўленай форме.

Студэнцкія атрады, якія працуюць на нарыхтоўцы бульбы і ўборцы агародніны, узнагароджваюцца:

За першае месца — адзін атрад ад вышэйшых і адзін атрад ад сярэдніх спецыяльных і прафесіянальна-тэхнічных навучальных устаноў Ганаровай граматай АК ЛКСМБ і грашовай прэміяй у суме 2000 рублёў кожная.

За другое месца — 2 атрады ад вышэйшых і 2 атрады ад сярэдніх спецыяльных і прафесіянальна-тэхнічных навучальных устаноў Ганаровай граматай АК ЛКСМБ і грашовай прэміяй у суме 1000 рублёў кожная.

За трэцяе месца — 2 атрады ад вышэйшых і 4 атрады ад сярэдніх спецыяльных і прафесіянальна-тэхнічных навучальных устаноў Ганаровай граматай АК ЛКСМБ і грашовай прэміяй у суме 700 рублёў кожная.

### З УЗНАГАРОДАЙ!

Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі, увесь калектыў ГДУ горача віншуюць прарэктара па навуковай рабоце прафесара МІХАІЛА Веніямінавіча НАВУЧЫЦЕЛЯ з нагоды яго ўзнагароджання Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР за шматгадовую навукова-педагагічную дзейнасць, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 60-годдзем з дня нараджэння.

## У НАШАЙ ШМАТТЫРАЖКІ— ЮБІЛЕЙ

Сёння, паважаныя чытачы, вы трымаеце ў руках чарговы нумар шматтыражнай газеты «Гомельскі універсітэт». Ён не зусім звычайны — юбілейны. Роўна 15 гадоў назад, 1-га верасня 1969 года, праз чатыры месяцы пасля адкрыцця Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, упершыню ўбачыла яна свет. І з першых дзён свайго існавання яна стала актыўным памочнікам рэктарата, партыйнай, камсамольскай, прафсаюзнай і іншых арганізацый у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў, у павышэнні эфектыўнасці і якасці вучэбнай і навуковай работы, у камуністычным выхаванні студэнцкай моладзі.

Кожную суботу навучальнага года студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі ГДУ чакаюць чарговы нумар шматтыражкі, каб даведацца аб навінах універсітэцкага жыцця, дасягненнях і творчых пошуках нашых вучоных, выдатных справах камсамольцаў ГДУ.

На працягу ўсіх гадоў свайго існавання шматтыражная газета «Гомельскі універсітэт» вядзе летапіс радасных дасягненняў і паўсядзённых будняў вядучай навучальнай установы Беларускага Палесся. Калектыў рэдакцыі газеты бачыць сваю задачу і ў тым, каб смела і прынцыпова весці барацьбу з недахопамі, якія яшчэ сустракаюцца ў нашай ВНУ.

Аўтарытэт шматтыражкі і цікавасць да яе ўзрастаюць з кожным годам. Аб гэтым сведчаць занятыя ёй прызавыя месцы ў конкурсах гарадскіх шматтыражных газет на лепшае асвятленне прыродаахоўнай тэматыкі, прапаганды фізкультурна-масавай і аздараўленчай работы. Вялікую работу праводзіць наша газета па камуністычнаму выхаванню студэнцкай моладзі, шырока асвятляе патрыятычны рух — удзел юнакоў і дзяўчат у працоўным семестры, які выхоўвае у іх грамадскую актыўнасць, далучае да ўдзелу ў агульнанародных справах.

У дзень юбілею газеты «Гомельскі універсітэт» хочацца выказаць вялікую падзяку шырокаму аўтарскаму актыву, які дапамагае работнікам рэдакцыі ў падрыхтоўцы цікавых і змястоўных матэрыялаў. Вакол сябе газета згуртоўвае літаратурныя сілы пачаткоўцаў. На яе літаратурных старонках рэгулярна змяшчаюцца іх вершы і празаічныя творы. Прыемна, што многія студэнты, якія закончылі універсітэт, працягваюць супрацоўнічаць з перыядычнымі выданнямі. Мы ўпэўнены, што ёсць нямала здольных юнакоў і дзяўчат сярод сёлетніх першакурснікаў. Запрашаем іх супрацоўнічаць з універсітэцкай шматтыражкай.

У рэдакцыі газеты ёсць яшчэ адны надзейныя памочнікі — слухачы аддзялення журналістыкі факультэта грамадскіх прафесій. Яны спрабуюць свае сілы ў нялёгкай газетнай справе, становяцца нашымі пастаяннымі аўтарамі.

*Рэха працоўнага семестра-84*

# ДРУЖЫНА ЎДАРНІКАЎ

## ДАГАВОР — ДОЎГАТЭРМІНОВЫ

Кожны год нешта новае, адметнае з'яўляецца ў студэнцкім будаўнічым руху нашага універсітэта. У працоўным семестры-84 такой «навінкай» стаў утвораны чатырмя атрадамі ГДУ аграпрамысловы комплекс. У яго ўвайшлі СБА самых розных напрамкаў: механізаваны — «Колас», будаўнічы — «Волаты», сельскагаспадарчы — «Чараўніцы», жывёлаводаў — «Расінка». Усе яны адправіліся ў саўгас «Камсамольскі» Рэчыцкага раёна. Адрас гэты быў выбраны не выпадкова. Яшчэ мінулым летам байцы СБА «Волаты» фізічнага факультэта пачалі там будаўнічыя работы па рэстаўрацыі жывёлагадоўчых памяшканняў. Выканаць намечанае за тэрмін меншы месяца практычна было немагчыма. Таму і заключыў атрад з саўгасам доўгатэрміновы дагавор, па якому ўзяў на сябе абавязацельствы закончыць пачатае, узвесці жылыя дамы для рабочых гаспадаркі, выканаць іншыя будаўнічыя работы.

Калі гаварыць шчыра, справы ў саўгасе «Камсамольскі» не ладзіліся ва ўсім. Трывала, на многія гады ўсталявалася ў раёне за ім характарыстыка — «адстаючы». Часта мяняліся тут кіраўнікі, а справы ў лепшы бок не рухаліся. Тлумачылася гэта разам з іншымі прычынамі і недахопам рабочых рук. Моладзь у вёсцы заставалася неахвотна, цягнулася ў горад.

Рэчыцкі райком камсамола вырашыў аказаць дапамогу саўгасу сіламі студэнцкіх будаўнічых атрадаў. «Волаты» з ГДУ і сталі першымі памочнікамі ў адстаючай гаспадарцы. А сёлета да іх далучыліся яшчэ тры вышэй названыя атрады.

— Вельмі карысная гэта справа — студэнцкі аграпрамысловы комплекс, — зазначае дырэктар саўгаса «Камсамольскі» Іван Сямёнавіч Крэсла. — Дапамога такой вялікай колькасці студэнцкіх рук вельмі для нас адчувальная.

Дагавор, заключаны студэнцкімі атрадамі ГДУ з саўгасам, безумоўна, дапаможа стаць яму «на ногі», выйсці з ліку адстаючых у эканамічна больш моцныя гаспадаркі раёна.

## ЭСТАФЕТУ — У НАДЗЕЙНЫЯ РУКІ

Лес, што абступаў прасёлкавую дарогу, раптам скончыўся і на павароце ў вёску Першамайск таблічка з надпісам і намаляванай на ёй стрэлкай-указальнікам паказала дарогу ў лагер СБА. Тут і жывуць байцы аграпрамысловага комплексу — зводнага атрада ГДУ імя 40-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Адразу бачна, што ўсё тут зроблена не на кароткі тэрмін, а надоўга. Улічваючы тое, што цяпер саўгас штогод будзе прымаць у сябе памочнікаў на час летняга працоўнага семестра, кіраўніцтва гаспадаркі паклапацілася аб жыллі для іх. Тут абсталяваны вагончыкі, пабудаваны інтэрнаты. Да пачатку працоўнага семестра яны яшчэ не былі гатовы прыняць студэнтаў. Таму «Волаты» прыехалі сюды раней за астатнія атрады, і ўсё падрыхтавалі да іх прыёму: абклалі цэглай зборны шчытавы будынак інтэрната, зрабілі ў вагончыках рамонт, добраўпарадкавалі тэрыторыю. Усё тут набыло выгляд утульнага, чыстага студэнцкага гарадка. «Прынялі» работу ў хлопцаў дзяўчаты атрадаў «Расінка» і «Чараўніцы»:

— Добры ў вас густ, рабяты!

...Будаўнічая справа «Волатам» знаёма да дробязей. 26 чалавек у атрадзе, і кожны мае пэўную будаўнічую спецыяльнасць. А калі спатрэбіцца, і замяніць могуць адзін аднаго. Чатыры будаўнічыя брыгады ўтварылі байцы «Волатаў», працуюць на самых розных аб'ектах. Спачатку яны закончылі рэстаўрацыю двух кароўнікаў у вёсцы Узнаж, пачатую яшчэ ў мінулым годзе. Поўная рэканструкцыя свінарніка праведзена байцамі атрада ў вёсцы Сведскае. Прыведзена ў парадак тэрыторыя каля запраўачнай станцыі ў в. Узнаж, пабудавана павець для сельскагаспадарчай тэхнікі саўгаса, заасфальтаваны два зернетакі ў вёсках Камсамольск і Узнаж. Зроблена шмат і пры добрай якасці работ. У гэтым вялікая заслуга камандзіра атрада Ігара Новіка, майстра Віктара Кузьміча. Кожная гадзіна ў атрадзе на ўліку, праца арганізавана так, каб не было ні мінуты прастою. З асаблівым настроем працавалі байцы атрада на ўзвядзенні жылога дома ў вёсцы Першамайск. Хвалююча і радасна будзе на душы ў камісара Анатоля Сялені, Аляксея Хрушчова, Мікалая Савасцьянава, якія будавалі гэты дом, калі зазвіняць ключы ў руках навасёлаў — рабочай саўгаса, даяркі, якая аддала шмат гадоў свайго жыцця працы ў роднай гаспадарцы і яе дачкі, таксама стараннай і ўжо вопытнай даяркі.

У студэнцкім лагеры на спецыяльным стэндзе вывешваюцца «маланкі» аб працоўных поспехах байцоў атрада «Волаты». Словы ўдзячнасці за ўдарную працу выказваюцца ў іх Аляксандру Качуру, Віктару Кайдунову, Ігару Кнышаву, Аляксандру Гусеву.

— Дарэчы, два апошнія з іх не толькі перадавікі ў працы, але і ў вучобе. Яны — выдатнікі, — удакладняе камандзір Ігар Новік.

У саўгасе ўсё робяць для таго, каб «Волаты» працавалі з поўнай аддачай.

Чарговая працоўная раніца ў саўгаснага прараба Я. Н. Сакалоўскага пачалася з «выбівання» бетону для атрада.

— Не затрымлівайце яго дастаўку студэнтам, яны прастойваць не павінны, — тлумачыць ён у тэлефонную трубку. І павярнуўшыся да камандзіра, заспакоіў:

— Не хвалюйся, Ігар, бетон будзе.

Вялікую павагу і аўтарытэт заваявалі «Волаты» сваёй самаадданай працай у рабочых саўгаса. Ніхто не сумняваецца ў тым, што юнакі, калі ўзяліся за што-небудзь, дык выканаюць усё на «выдатна». Невыпадковасцю было і тое, што СБА «Волаты» утрымліваў першынство сярод 9 студэнцкіх атрадаў, якія прыехалі ў саўгас «Камсамольскі» на традыцыйны фестываль СБА Рэчыцкай зоны. Шмат цікавых спаборніцтваў праходзіла тады ў студэнцкім гарадку і ў многіх з іх лідзіравалі «Волаты». Камандзір Рэчыцкага занальнага штаба, студэнт гістфіла ГДУ Сяргей Фядосенка ўручыў ім шматлікія граматы.

Сёлетняе працоўнае лета ў СБА «Волаты» ужо дзесятае па ліку. Прыняў ён добрую эстафету ў сваіх папярэднікаў, з гонарам пранёс праз 5 гадоў вучобы і перадасць яе таксама ў надзейныя рукі.

## ПАХ ХЛЕБА

Застаць байцоў механізаванага атрада «Колас» у студэнцкім лагеры аказалася справай складанай. Вельмі гарачы, напружаны цяпер час у хлебаробаў — ідзе жніво. Таму з самай раніцы, як толькі скідвае расу трава, і да позняга вечара, калі вёска запальвае агні, знаходзяцца ў полі юнакі.

Тры камбайны СК-5 «Ніва» даручылі ў саўгасе «Камсамольскі» студэнтам-механізатарам. Хаця сказаць даручылі будзе не зусім дакладна. Даручыць можна тэхніку спраўную, надзейную ў рабоце і не баяцца, што студэнты выведуць яе са строю ў адказны для хлебаробаў час. Ім жа выдзелілі камбайны, два з якіх аказаліся такімі, што патрабавалі неадкладнага рамонту. Ім і заняліся камандзір атрада Мікалай Дзергачоў, Сяргей Какашынскі і іншыя рабяты. Рамантавалі іх спачатку ў Рэчыцкай сельгастэхніцы, потым рэгулявалі і наладжвалі непасрэдна ў саўгасе. Калі Мікалай, які ўжо тры гады працуе ў механізаваным атрадзе, ведае тэхніку дасканала, як кажуць, з заплюшчанымі вачыма разбярэ і сабярэ камбайн, то Сяргей у гэтай справе навічок. Але яго цярплівасць і настойлівасць перамаглі. Давёў да ладу сваю «Ніву» і ён, паспеў да пачатку жніва.

Цяжка цяпер уявіць байца атрада, студэнта эканамічнага факультэта Федзю Белаша без старэнькай, але ўсюды паспяваючай аўтамашыны. Ён сабраў яе, даў ёй літаральна другое жыццё таксама сваімі рукамі. Дапамаглі, зразумела, таварышы, і зараз Фёдар паспявае ўсюды: падвезці байцам СБА «Волаты» будаўнічыя матэрыялы, іншыя неадкладныя атрадныя справы зрабіць.

Багаты сёлета ўраджай збожжавых вырашчаны ў саўгасе. Каля 30 цэнтнераў з гектара намалочваюць механізатары. Даўно не дасягалі ў «Камсамольскім» такіх вынікаў, і каб цяпер паспець своечасова і без страт убраць з поля збожжа, вельмі дарэчы дапамога студэнцкіх рук. Тры экіпажы ўтварылі байцы мехатрада «Колас». У першы ўвайшлі камандзір М. Дзергачоў са сваім памочнікам Генадзем Дашуком, у другі — Сяргей Какашынскі і Аляксандр Філіпаў, на трэцім камбайне працуюць Сяргей Салачук і Аляксандр Бадуноў. Асноўная плошча, дзе ўбіраюць хлеб студэнты-механізатары, размешчана каля вёскі Узнаж.

У канторы саўгаса на бачным месцы — экран ходу спаборніцтва на жніве паміж саўгаснымі механізатарамі. У лік спаборнічаючых увайшлі і студэнцкія экіпажы. Толькі крышачку ўступае вопытнаму камбайнеру Івану Паўлавічу Бенчуку Мікалай Дзергачоў, увесь час літаральна «наступае» яму на «пяткі». Стараюцца быць на вышыні і астатнія байцы «Коласа».

У дзень майго знаходжання ў атрадзе Мікалай вярнуўся з таварышамі з поля позна ўвечары з асабліва прыўзнятым настроем. З бункера камбайна, на якім ён працуе разам з Генадзем Дашуком, саўгасны шафёр адвёз на зернеток звыш 20 тон жыта.

...Заціхае студэнцкі гарадок, адпачывае перад наступным працоўным днём. Загарэлыя, з прыемнай стомай ва ўсім целе, як сапраўдныя хлебаробы, вяртаюцца з поля байцы мехатрада «Колас». І іх пакой напаўняецца непаўторным пахам спелай збажыны.

## ПРЫКЛАД ~~КАМУНІСТА~~ камандзіра

Будатрадаўская форма Галі яшчэ не страціла свайго першапачатковага колеру, не выліняла пад гарачымі сонечнымі промнямі, не прапахла салёным потам і дымам кастра. Бо апранула яе дзяўчына толькі сёлета, у сваё першае студэнцкае будатрадаўскае лета. Але заззяў ужо на ёй знак ЦК ВЛКСМ «Малады гвардзеец пяцігодкі». Ім камісара зводнага студэнцкага атрада ГДУ, які працуе ў саўгасе «Камсамольскі», камандзіра сельскагаспадарчага атрада фізічнага факультэта «Чараўніцы» Галіну Петухову ўзнагародзілі на фестывалі СБА Рэчыцкай зоны, які праходзіў 5 жніўня. Тыя хвалюючыя мінуты запаматаюцца дзяўчыне надоўга, будуць зноў і зноў нагадваць: яна абавязана і ў далейшым працаваць так жа самаадданна, натхняць свой атрад на новыя поспехі.

Узначаліць атрад дзяўчат-першакурсніц фізічнага факультэта Г. Петуховай даверылі не выпадкова. Яе арганізатарскі талент праявіўся яшчэ на першай «бульбе». Таму калі вярнуліся першакурснікі ў вучэбныя аўдыторыі, Галю абралі камсоргам групы, даверылі ўзначальваць шэфскі сектар на факультэце. У час фарміравання студэнцкіх атрадаў да працоўнага семестра-84 ваганняў не было, каго прызначыць камандзірам атрада «Чараўніцы».

...Быў пасляабедзенны час і ў студэнцкім гарадку панавала цішыня — усе знаходзіліся на працоўных аб'ектах. Толькі ў адным з пакояў інтэрната перад начной зменай адпачывалі байцы атрада «Чараўніцы». Былі сярод іх Галя і камісар атрада Люда Гулякова. Зернеток, дзе не спыняецца праца круглыя суткі, стаў для атрада ў гарачы час жніва асноўным месцам яго работы. У тры змены наладжана праца студэнтак. За кожную з іх паспяваюць яны peралапаціць, прасеяць зерне новага ўраджаю дзесяткі тон.

— Стараюцца ўсе нашы дзяўчаты, — расказвае Л. Гулякова — Зразумела, што і нялёгка бывае. Але наша Галя ўмее заўсёды падбадзёрыць цёплым словам, жартам, каб «не вешалі нос», асабістым прыкладам натхніць на працу.

А Галя ўсміхаецца:

— Гэта, мабыць, у мяне ад мамінага характару. Яна не любіць ныцікаў, і мяне выхоўвала так, каб не баялася цяжкасцей.

Неадкладных работ у вёсцы летам безліч. Іх і выконвалі дзяўчаты з «Чараўніц»: прапалолі звыш 20 га караняплодаў, нарыхтавалі дзесяткі тон сена. Не радавала сёлета лета цёплым, сонечным надвор'ем. І калі ішлі дажджы, дзяўчаты без справы не сядзелі. Галя Дулуб, Лена Ганжурава, Ларыса Маркевіч і Галя Малашанка прапанавалі:

— Давайце створым жывёлагадоўчае звяно, будзем дапамагаць даяркам на ферме вёскі Сведскае.

Раніцай і вечарам адвозілі дзяўчат на саўгаснай машыне даіць кароў.

## ПРАЦЯГ ДОБРАЙ СПРАВЫ

Побач са студэнцкім лагерам — малочнатаварная ферма в. Першамайск. У дажджлівае надвор'е знайшлі і там сабе «Чараўніцы» работу: пабялілі кароўнік, навялі ў памяшканні парадак.

У атрада «Чараўніцы» гэта быў першы працоўны семестр. Цяпер з упэўненасцю можна сказаць, што «першы блін не атрымаўся комам». Гэта яшчэ раз пацвярджае і тое, што на фестывалі СБА ўзнагароду атрымала не толькі камандзір Галя Петухова, але і байцы яе атрада Ірына Батура і Тамара Лаўшук. На іх будатрадаўскіх формах з'явіліся значкі «Майстар-умелец». І выпадковасцю гэта не растлумачыш. Яны ж працуюць у атрадзе, дзе выдатны камандзір!

Ужо як звычайная справа ўспрыймаюцца цяпер атрады жывёлаводаў. Зусім невялікая ў іх «біяграфія» — бярэ пачатак з мінулага працоўнага семестра, калі студэнты матфака выехалі ў саўгас «Рэчкі» Веткаўскага раёна, каб даглядаць жывёлу, даіць кароў. На справе яны даказалі, што і гэта пад сілу студэнтам. У першаадкрывальніц новага напрамку дзейнасці СБА знайшліся паслядоўнікі — атрады «Расінка» і «Сож».

Месяц працы дзяўчат з «Расінкі» у саўгасе «Камсамольскі» закончыўся ў пачатку жніўня.

— Праводзілі мы іх вельмі цёпла, шчыра дзякавалі за стараннасць, — расказвае дырэктар І. С. Крэсла. — Камандзіру Марыне Леўшуновай, чатыром дзяўчатам уручылі граматы, запрашалі прыязджаць і на наступны год. Сто кароў даглядалі студэнткі, добрасумленна адносіліся да працы, і як вынік — узраслі надоі, павысілася тлустасць малака.

Тры разы ў дзень спяшаліся на ферму і дзяўчаты з атрада «Сож». Яны працавалі таксама ў Рэчыцкім раёне, у калгасе «Новы шлях». Цёплыя, белыя струменьчыкі малака хутка напаўнялі даёнкі ў Зіны Петрашэнка, Элы Савянок, Ларысы Чураковай, Тані Мельнікавай. Месяц у вёсцы Ліскі, дзе жылі дзяўчаты, праляцеў неўпрыкмет. Тым больш хутчэй ляцеў час, што ён быў запоўнены не толькі адной працай. У перапынках паміж дойкамі праводзілі студэнткі палітінфармацыі на ферме, выступалі вечарам у вясковым клубе з канцэртамі мастацкай самадзейнасці.

Піліп Іванавіч Мельнікаў, галоўны эканаміст калгаса «Новы шлях», выказаў аднадушную думку ўсіх калгаснікаў:

— Малайцы, дзяўчаты!

• • •

У ПРЫГОЖЫМ, маляўнічым месцы размешчаны вёскі саўгаса «Камсамольскі». Вакол, як кінуць вокам, густыя сасновыя лясы. Таму і былі гэтыя мясціны ў гады Вялікай Айчыннай вайны партызанскім краем. Многа тут былых воінаў, ветэранаў, удоў, сем'яў загінуўшых. Спяшаюцца пасля работы студэнты да іх дамоў, дапамагаюць нарыхтаваць сена, дроў на зіму.

У в. Першамайск прыгажосць асаблівая. Побач з лагерам СБА — вялікае возера. Цікавую легенду аб яго ўтварэнні расказалі студэнтам мясцовыя старажылы. Стромкія сосны, якія акружаюць возера, глядзяцца ў яго блакітную люстраную роўнядзь. Барвовы дыск сонца апускаецца за лес, тушыць свае промні ў празрыстай вадзе возера, над якім чуюцца гукі гітары, звонкія песні. Закончаны яшчэ адзін напружаны працоўны дзень у байцоў студэнцкіх атрадаў ГДУ...

Старонку падрыхтавала карэспандэнт Т. ДУБЯК.

